УДК 633.16.«321»:[631.82:581.19]

В. М. ГРЫБ, С. І. ГРЫБ, І. І. БЕРАСТАЎ

НАЗАПАШВАННЕ І ЯКАСЦЬ БЯЛКУ Ў ЗЕРНІ ЯРАВОГА ЯЧМЕНЮ Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД РОЗНЫХ АГРАФОНАЎ ВЫРОШЧВАННЯ

Выкарыстанне мінеральных угнаенняў і павелічэнне іх доз павышаюць ураджайнасць і колькасць бялку ў зерні, галоўным чынам за кошт павелічэння гардэінавай фракцыі. У выніку гэтага паніжаецца адносная колькасць вода- і солерастваральных бялкоў і павялічваецца наяўнасць спіртарастваральных бялкоў у агульным бялку [1, 2]. Пры адкорме свіней зернем ячменю, вырашчанага на розных дозах азотных угнаенняў, але з аднолькавай колькасцю лізіну (за кошт дабавак), прырост жывёлін быў меншы, калі ўжываўся рацыён з высокімі дозамі азотных угнаенняў [3].

Такім чынам, пры павелічэнні колькасці бялку ў зерні за кошт угнаення яго кармавая каштоўнасць паніжаецца.

Аграхімічныя доследы, як правіла, праводзяцца на адным або двух раяніраваных сартах ячменю. У сувязі з гэтым цікава вывучыць рэакцыю групы сартоў і сортаўзораў конкурснага сортавыпрабавання на розных аграфонах. Мэтай даследавання было выявіць асаблівасці генатыпічных рэакцый па назапашванні бялку ў зерні ў сувязі з селекцыяй на якасць сортаўзораў ураджайнага тыпу.

Палявыя доследы праводзілі ў 1982—1984 гг. на эксперыментальнай базе «Жодзіна» Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці на дзярнова-падзолістай лёгкасуглінкавай глебе сярэдняй ступені акультуранасці. У першы год эксперымента 34 узоры конкурснага сортавыпрабавання вырошчвалі на трох фонах: $N_{30}P_{50}K_{70}$, $N_{90}P_{90}K_{120}$, $N_{150}P_{120}K_{170}$; у 1983 г., акрамя гэтых доз, 17 узораў вывучалі яшчэ на фоне без угнаенняў; у 1984 г. павышэнне мінеральнага жыўлення суправаджалася змяненнем нормы сяўбы (17 узораў). Мінеральныя ўгнаенні (аміячную салетру, двайны суперфасфат, хлорысты калій) уносілі пад перадпасяўную апрацоўку глебы. Сяўбу праводзілі сеялкай ССФК-7 пры норме высявання 4,5 млн зярнят/га, убіралі ўраджай камбайнам «Хеге-125». Уліковая плошча дзялянкі 10—15 м^2, паўторнасць чатырохразовая.

Кожны год вывучаліся розныя сортаўзоры ячменю; пастаяннымі былі толькі сарты Надзя, Раланд, Іда.

Табліца 1. **Колькасць сырога бялку ў зерні сортаўзораў на розных аграфонах, % на абсалютна сухое рэчыва**

№ п.п.	Сорт, узор	1982 г.			1983 г.				Сярэдняе за 1982—1983 гг.		
		фон жыўлення									
		$N_{30}P_{50}K_{79}$	$N_{90}P_{90}K_{120}$	$N_{150}P_{120}K_{170}$	без угнаення	$N_{30}P_{50}K_{70}$	$N_{90}P_{90}K_{120}$	$N_{150}P_{120}K_{170}$	$N_{30}P_{50}K_{70}$	$N_{90}P_{90}K_{120}$	$N_{150}P_{120}K_{170}$
1	Надзя	8,4	9,2	9,8	11,5	11,6	13,3	13,8	10,0	11,3	11,8
2	Фаварыт	9,2	9,3	11,6	10,5	11,8	13,0	14,2	10,5	11,2	12,9
3	Жодзінскі 5	9,1	9,8	13,3	11,3	12,0	13,0	14,0	10,6	11,4	13,6
4	114/77	9,5	10,4	11,4	11,7	12,6	13,5	14,5	11,1	11,9	13,0
5	Янка	8,2	9,3	12,0	10,8	11,6	13,6	14,4	9,9	11,4	13,2
6	518/78	8,0	9,0	10,8	9,9	10,9	12,3	13,6	9,5	10,6	12,2
7	148/77	8,3	9,3	10,6	10,8	11,8	13,5	13,5	10,0	11,4	12,0
8	1188/792	9,4	10,3	11,3	10,9	11,6	13,4	14,2	10,5	11,8	12,8
9	Крынічны	7,9	9,9	10,4	10,8	11,6	12,8	14,1	9,8	11,4	12,3
10	2073/77	9,2	10,6	11,6	11,9	12,3	14,1	14,5	10,8	12,4	13,0
	Сярэдні па фону ўраджай зерня, ц/га	29,7	39,2	44,8	43,1	46,3	55,0	53,4	38,0	47,1	49,1

Табліца 2. **Назапашванне сырога бялку ў зерні сартоў і ўзораў ячменю (1983 г.)**

№ сортаўзору	Маса 1000 зярнят, г					Колькасць сырога бялку, мг/адно зярнятка				
	без угнаення	$N_{30}P_{50}K_{70}$	$N_{90}P_{90}K_{120}$	$N_{150}P_{120}P_{170}$	$\overline{X}$	без угнаенняў	$N_{30}P_{50}K_{70}$	$N_{90}P_{90}K_{120}$	$N_{150}P_{120}K_{170}$	$\overline{X}$
1	38,3	38,7	36,6	36,0	37,4	4,4	4,5	4,8	4,9	4,65
2	38,0	39,3	38,1	34,3	37,4	4,0	4,6	4,9	4,9	4,60
3	45,9	45,7	45,9	45,3	45,7	5,2	5,5	5,9	6,3	5,72
4	43,2	43,9	43,7	42,1	43,2	5,0	5,5	5,9	6,1	5,62
5	48,4	49,9	47,2	45,5	47,7	5,2	5,8	6,4	6,5	5,97
6	41,3	41,5	39,8	34,9	39,4	4,1	4,5	4,9	4,7	4,55
7	41,2	42,5	41,4	39,4	41,1	4,4	5,0	5,6	5,3	5,07
8	46,2	45,4	45,3	43,3	45,0	5,0	5,2	6,1	6,1	5,60
9	41,7	43,4	43,2	38,3	41,6	4,5	5,0	5,5	5,4	5,10
10	41,3	44,4	44,0	41,3	42,7	4,9	5,4	6,2	6,0	5,62
$\overline{X}$	42,55	43,47	42,52	40,04		4,67	5,10	5,62	5,62	
$НІР_{05}$	0,966				1,528	0,146				0,232
$НІР_{01}$	1,306				2,065	0,198				0,313